
Бацькаўшчына



WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „BACKAUSCYNA" („FATHERLAND") No. 66, 6 5. 1951. Authorized by EUCOM Hqs. Civil Affairs Division 1 January 1951, Nr. UNDP 225. Responsible Publisher:

WLADIMIR BORTNIK.

Printing Office: Buchdrukkerei Georg Jakob, Munich, Pütrichstr 3a. Cirkulation: 3.500 copies. Sponsor: IRO. Post Adress: „Backauscyna", (13b) München-Feldmoching, DP. Lager, Block 140, Zim. 6. Die Administration der Weissruthenischen Zeitung „Backauscyna" (13b) München-Feldmoching, DP. Lager, Block 140, Zim. 6.

Цана 30 н. фэн., для заграніцы— 50 н. фэн.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 66 — 6 травеня 1951 — ГОД ВЫДАНЬНЯ 5

Зварот Прэзыдэнта БНР

Дарагія Суродзічы!

Вітаю Вас з 33-мі Угодкамі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі і жадаю Вам усім сілы й вытрываласьці у далейшым змаганьні за рэалізацыю нашых Вялікіх Ідэалау.

Беларускі Народзе! 33-ці раз адзначаеш Ты сяньня урачыстым сьвятам той вялікі мамэнт, які узварушыу сэрцы Беларусі.

Радасьць гэта была так вялікая, што ніводзін з акупантау, найжарстачэйшымі мэтадамі ня здолеу яе заглушыць.

Радасьць гэтая, як спадчына нашага духовага багацьця, пераходзіла ад старэйшых да маладзейшых, ад паміраючых да народжаных.

Гэты скарб нашае жыцьцевае сілы і есьць найлепшым гарантам нашае канцавое перамогі.

На працягу апошніх 30 год, калі акупанты, здавалася-б, так моцна усталяваліся на нашай зямельцы, Ты усероуна, у гэты памятны дзень штогод сходзіуся на урачыстыя абрады, ці маліуся патайком, асалоджваючы сваю душу, разганяючы горыч.

Ты не зьняверыуся, Ты ня траціу духу, надзеі у зьдзейсьненьне сваіх ідэалау, навет у часы, калі увесь цывілізаваны сьвет бачыу у акупантах нашых сваіх найлепшых саюзьнікау, прыяцеляу, супрацоунікау.

33-ія угодкі Сьвята Радасьці абходзім мы у момант, калі увесь цывілізаваны сьвет загутарыу з нашым акупантам як з найлюцейшым ворагам людзтва называючы яго так, як мы яго звалі 33-ы гады—тыранам, варварам, разбойнікам.

Беларускі Народзе! У 33-ія угодкі Нашага Сьвята, Ты маеш сабе спадарожнікау супраць свайго тырана.

Сьмялей падымай галаву! Будзь гордым за сябе і за свой урад, што непахісна на працягу 33-ох год нес свой вызвольны сьцяг з дэвізамі, якія сяньня сталі дэвізамі усяго культурнага сьвету.

Вышэй падымай Сьцяг Б.Н.Р., каб увесь культурны сьвет пабачыу яго паміж сваіх, як старога камбатанта супраць маскоуска-бальшавіцкае тыраніі.

Беларуская эміграцыя! Ты змучаная фізычна умовамі абставін. Хай праблескі зблізкэньня нашага вызваленьня узмоцняць твае сілы!

Мацней сьціскайце рады нашага вызвольнага фронту!

Дружней за помач самлелым рукам твайго авангарду!

Няхай не застанецца ніводнага беларускага эмігранта паза шэрагамі Б.Н.Р.

Жыве Беларусь у змаганьні!

Жыве Беларуская Народная Рэспубліка!

Мікола Абрамчык.

І Азія і Эуропа

Рэдка калі бывае, што пэрсанальная зьмена на адказным становішчы выклікае такі жывы водгалас у цэлым сьвеце, як нядаунае адкліканьне прэзыдэнтам Труманам генэрала Мак Артура із становішча галоунакамандуючага збройнымі сіламі ЗН у Карэі і замена яго дасюлешнім галоунакамандуючым наземнымі збройнымі сіламі ЗН у Карэі генэралам Рыджвэй. Сама Амэрыка уважала гэты крок на столькі важным, што навет прэзыдэнт Труман на другі дзень пасьля гэтага зьвярнууся да амэрыканскага народу із спэцыяльнай радыяпрамовай, у якой выясьніу прычыны адкліканьня ген. Мак Артура й яшчэ раз спрэцызавау амэрыканскую палітыку у Карэі. Гэты водгалас, зразумела, быу выкліканы ня толькі тым, што Мак Артур зьяуляецца нязвычайна здольным і дасьветчаным ваенным камандзірам із бліскучай ужо ваеннай славай, скольки тым, што рэпрэзэнтавау ен собскую палітычную лінію у дачыненьні да Далекага Усходу, адменную ад лініі ураду ЗША, за якую сьмела й адкрыта высказвауся.

Мак Артур, дакладна пазнаушы палажэньне на Далекім Усходзе на аснове собскае ваеннае практыкі, дамагауся прыняцьця станоукіх мерау супраць камуністычнага Кітая. Галоунымі пунктамі гэтых дамаганьняу было: бамбардаваньне ваенных аб'ектау на кітайскай тэрыторыі й заахвочаньне Чан-Кай Шэка да збройнага выступленьня супраць чырвонага Кітая, забясьпечыушы яму неабходную ваенную помач. Пры гэтым —на думку Мак Артура — абарона Азіі перад камуністычнай агрэсыяй зьяуляецца справай далека важнейшай, чымсьці абарона Эуропы.

Ня трэба й даказваць, што калі-б усе гэтыя мерапрыемствы, якіх дамагауся Мак Артур, былі зрэалізаваныя, дык адкрытая вайна Амэрыкі з цэлым Кітаем была-б няухільнай. Урад ЗША, асуджаючы такую палітыку Мак Артура, верыць яшчэ, што удасца вайну зьлякалізаваць у самой Карэі і гэткім чынам усьцерагчыся, прынамсі на нейкі час, трэйцяй сусьветнай вайны, пры гэтым робіць ен усякія намаганьні дайсьці да паразумленьня з Кітаем Мао-Тсэ Тунга на шляху дыпляматычным.

«Есьць зусім магчымым, што ня гледзячы на нашыя станоукія намаганьні удасца камуністым разьдзьму хаць сусьветную вайну. Але было-б памылкай, навет трагічнай памылкай, калі-б мы узялі на сябе ініцыятыву у расшырэньні вайны»—заявіу прэзыдэнт Труман у успомненай прамове.

Прыгледзімся цяпер, якія вынікі магла-б пацягнуць за сабой тая акалічнасьць, калі-б дамаганьні Мак Артура былі поунасьцю выкананыя? Уступленьне Амэрыкі у вайну з цэлым Кітаем зьвязала-б усе амэрыканскія ваенныя сілы на Далекім Усходзе, у выніку чаго справа абароны заходняй Эуропы, была-б зусім занядбанай, што дало-б Саветам магчымасьць, не занятым непасрэдна на Усходзе, бо за іх там ваюе Кітай, легка заатакаваць заходнюю Эуропу й блізкі Усход, вельмі важны з гледзішча на прадукцыю такога цэннага ваеннага матарыялу, як нафта.

Ня выключана, што Мак Артур зусім ня мыляецца. Бо ня выключана, што навет ня гледзячы на такія намаганьні ЗША вайну зьлякалізаваць у Карэі, дойдзе аднак да адкрытай вайны з цэлым Кітаем, выкліканай гэтым апошнім, то усе-ж такі ЗША робяць усе магчымае такую эвэнтуальнасьць адхіліць, у крайнім выпадку яе адсунуць на пазьней.

Задзіночаныя Штаты Амэрыкі дакладна здаюць сабе справу з таго, што вайну у Карэі распаліу Савецкі Саюз. Прэзыдэнт Труман у сваей прамове заявіу адрыта: „За пауночнакарэйцамі й кітайскімі камуністымі на фронце стаяць далейшыя мільены кітайскіх жаунерау, а за кітайцамі стаяць панцыры, самалеты, падводная лодкі, жаунеры і валадары Сав. Саюзу». Такім чынам Амэрыка правільна уважае, што Кітай есьць толькі савецкім сатэлітам і што галоуная небясьпека ідзе з чырвонае Масквы. А у вабліччы насьпяваючага сусьветнага канфлікту Савецкі Саюз можа непасрэдна заатакаваць толькі заходнюю Эуропу, бо ягоныя эурапэйскія сатэліты за слабыя, каб самі, хоць-бы із савецкай помаччу у узбраеньні змаглі што-небудзь дакапаць супраць Захаду. Таму, дацэньваючы важнасьць далекаусходняга фронту, Амэрыка ня думае пакідаць Эуропы на ласку ейнага собскага лесу.

(—іч)

ПАЧАТАК НОВАГА КУРСУ У ЗША

Да народау паняволеных бальшавізмам

Амэрыканская палітыка доугі час не дапэньвала вялізарнай ролі паняволеных народау у змаганьні з бальшавізмам, як і не зауважала свайго прыроднага саюзьніка, якім зьяуляюцца нерасейскія народы СССР. Такая палітыка была, як ведама, непасрэднай прычынай цэлага раду міжнародных няудачау ЗША і у вельмі вялікай меры дала магчымасьць саветам узмоцніць іхную афэнзыву супраць Захаду, заатакаваушы яго найвастрэй іменна на тых адрэзках, на якіх ня былі яны Захадам заатакаваныя самі.

Аднак апошняя вялікая афэнзыва саветау супраць Захаду, у якой бальшавікі умела сумелі выкарыстаць мільенныя масы цэлага сьвету, як і ход Карэйскае вайны, дзе, апрача рэгулярных збройных сілау, не апошнюю ролю адыгрывае цэлая армія чырвоных партызанау, адкрылі вочы многім амэрыканцам. Таму сярод уплывовых палітыкау Амэрыкі, што раз часьцей чуваць галасы аб неабходнасьці выкарыстаньня супраць Савецкага Саюзу паняволеных ім народау. Гэтак між іншым рэспубліканскі сэнатар Вільям Ноуленд заявіу нядауна перад задзіночанымі замежнаю й вайсковаю камісіямі сэнату, што «вялікая колькасьць нездаволеных людзей, што імкнуцца да свабоды у СССР, маглі-б быць лепшаю «таемнаю зброяю», чымсьці атамная бомба». Такое перакананьне выказау таксама губэрнатар штату Нью-Ерк і рэспубліканскі кандыдат на прэзыдэнта ЗША у вапошніх выбарах Томас Д'юі. У сваей прамове, сказанай нядауна з нагоды 142 гадавіны нараджэньня Абрагама Лінкольна, ен даслоуна заявіу: «Я ужо бачу надыходзячы той дзень, калі савецкія нявольнікі у Чэхаславаччыне, Польшчы, Мадзяршчыне, Баугарыі, Румыніі, Кітаі і у самой Савецкай Расеі асвабодзяцца ад сваіх кайданау цераз абвешчаньне свайго вызваленьня. Калі гэты дзень надыйдзе, дыктатары у Крамлі больш ня будуць чуцца бясьпечнымі».

Афіцыяльнай азнакай пачатку новага курсу у амэрыканскай палітыцы у дачыненьні да паняволеных бальшавізмам народау зьяуляецца рэзалюцыя, падпісаная 21 сэнатарам, якая была унесеная 9 лютага селета у сэнат і адначасна у палату рэпрэзэнтантау. У гэтай рэзалюцыі між іншым гаворыцца, што »амэрыканскі народ глыбака спачувае народам Савецкага Саюзу з прычыны штучных заслонау, што іх аддзяляюць ад амэрыканскага народу й не даюць ім магчымасьці даведацца аб запраудных зычэньнях Задзіночаных Штатау, жыць у згодзе зь іншымі народамі і зь імі супрацоунічаць над далейшым разьвіцьцем ідэалау людзкасьці».

Гэта ужо вялікі крок наперад, калі адказныя амэрыканскія палітыкі пачынаюць гутарыць з падсавецкімі народамі цераз галовы афіцыяльных камуністычных заправілау. Ня гледзячы аднак на гэта, у рэзалюцыі амэрыканскіх сэнатарау, як і іншых амэрыканскіх высказваньнях на гэтую тэму, да нядауна было яшчэ шмат недасказанага. Хаця ужо што раз часьцей гаварылася не аб «расейскім» ці «савецкім» народзе, але аб «народах Савецкага Саюзу», то днак ня было яшчэ мовы аб вызнаньні запраудных нацыянальных правоу гэтых народау на іхную дзяржауную незалежнасьць. А ужо нявымоуна прыкрым дысанансам гучэлі словы заступніка міністра замежных справау ЗША і упаунамочанага у справах узаемадачыненьняу з кангрэсам Мэк-Фола. У вадказ на напад савецкага прафэсара Пасьпелава, што быцпам амэрыканцы імкнуцца зьвішчыць расейскі народ, Мэк-Фол, каб даказаць зусім адваротнае, успамінае факт, што палітыка былага прэзыдэнта Вільзана пасьля першай сусьветнай вайны была супраць падзелу расейскае імпэрыі на нацыянальныя дзяржавы паняволеных ею народау. Прыводзячы на свае апрауданьне гэты сумны факт, Мэк-Фол гэтым самым пасярэдна згаджаецца з палітыкай Вільзана і у дачыненьні да сяньняшніх дзен, палітыкай, якая, між іншым, была грубым запярэчаньнем абвешчаных ім 14 пунктау.

І вось на фоне усіх гэтых высказваньняу палітычна разумным, а у дачыненьні да нас справядлівым і узапрауды прыязным быу голас выдатнага амэрыканскага палітыка, калішнага рэспубліканскага кандыдата на прэзыдэнта, Гарольда Е. Стасэна, паданы ім у ягонай радыяпрамове 22 студзеня селета. Ен запрапанавау новую палітычную праграму, праводзячы якую, Задзіночаныя Штаты маглі-б па той бок зялезнай заслоны выклікаць рэвалюцыю паняволеных народау супраць бальшавіцкіх прыгнятальнікау. Гэтая праграма спрэцызаваная у сямі наступных пунктах (цытуем за ангельскім і нямецкім выданьнямі «АБН—Карэспандэнцыі», № 3, за сакавік 1951):

«1. Незалежнасьць Украіны, Эстовіі, Летувы, Туркестану, Беларусі, Польшчы, Чэхаславаччыны, Румыніі, Баугарыі і Мадзяршчыны.

2. Звальненьне мільенау палітычных вязьняу, што у савецкіх канцэнтрацыйных лягерах выконваюць прымусовыя работы.

3. Зварот зямлі сялянам для іхнага прыватнага гаспадараваньня.

4. Права для работнікау усяго сьвету арганізавацца й заключаць калектыуныя дагаворы з працадауцамі

(Заканчэньне на 4 бал.)

Шляхам Незалежнасьці

Месяц назад беларускае грмадзянства на эміграцыі адзначыла трыццаць трэйцюю гадавіну абвешчаньня Радаю БНР 25 сакавіка 1918 г. у Менску Беларусі вольнай незалежнай дэмакратычнай рэспублікай. Гэтая падзея мае эпахіяльнае значэнь не у беларускім нацыянальна—вызвольным руху, бо яна у гісторыі ягонай адкрывае новы, зусім адменны ад папярэдняга пэрыяд.

Да гэтага часу беларускі рух ня меу перад сабою выразна азначанай палітычнай мэты й ня выходзіу яшчэ паза рамы канцэпцыяу аутаноміч ных, а у найлепшым выпадку фэдэралістычных з Расеяй. Беларускі народ, які у старыну жыу вольным і незалежным жыцьцем у задзіночаным беларускім гаспадарстве—Вялікім Княстве Літоускім, які тварыу на Усходзе Эуропы найвялікшую культурную й мілітарную сілу, перад якой дрыжэла навет Масква, у сілу гістарычных абставінау стауся потым нявольнікам імпэрыялістычнае Расеі. Гэтая палітычная няволя падмацаваная няволяй нацыянальнай, культурнай і сацыяльнай, была такім непасільным прыгнетам для народу, што ен часова ня толькі страціу свае незалежніцкія ідэалы, але навет забыуся у вялікай меры свайго нацыяналянага [illegible] Такім чынам некалі магутны й [illegible] дамы сваіх нацыянальных мэт[illegible] род стауся толькі этнаграфічнай масай у літаральным значэньні гэтага слова.

Сувязь паміж мінуушчыняй і сучаснасьцю была такім чынам парваная. Вось дзеля чаго беларускі народ ня мог адразу навязаць да сваей слаунай гаспадарстваускай мінуушчыні у першыя пэрыяды свайго нацыянальнага адраджэньня. Вось дзеля чаго, вяртаючыся йзноу да нацыянальнае сьведамасьці, мусіу ен тварыць свае нацыянальныя вартасьці ад самага пачатку. Дык і ня дзіва, што на першым этапе свайго нацыянальнага адраджэньня, якое зазначылася спачатку у галіне толькі культурнай, потым сацыяльнай і напасьледак палітычнай, думка аб гаспадарстваускай незалежнасьці была яшчэ за сьмелай і передчаснай. Народ да яе яшчэ не дасьпеу.

Аднак у працэсе масавага нацыянальнага усьведамленьня і у віры змаганьня за свае нацыянальныя й сацыяльныя правы і палітычная дасьпеласьць беларускіх народных масау прыходзіць даволі хутка. Найбольш глыбокім і канкрэтным ейным выражэньнем і зьяуляецца Акт 25 Сакавіка.

Абвешчаньне у 1918г. Беларусі вольным і незалежным гаспадарствам зьяуляецца ня справай групы беларускае інтэлігенцыі, як гэта хочуць прадставіць нашыя ворагі, але актам агульнанародным. Ужо той факт, што дэлегаты Першага Усебеларускага Кангрэсу з 1917г., які паклікау Раду БНР і пераліу на яе усе свае пауна-моцтвы, былі выбраныя самым беларускім народам пры захаваньні усіх дэмакратычных выбарчых прынцыпау, з праунага гледзішча надае Акту 25 Сакавіка агульнанародны характар.

Але гэтая агульнанароднасьць Акту 25 Сакавіка найшырэй і найнепасрадней праявілася у тым, што беларускі народ у цэлай сваей масе ідэі 25 Сакавіка вызнау поунасьцю за ідэі свае собскія. Пачынаючы ад славутага Слуцкага Паустаньня 1920г. і цераз ланцуг бесьперапынных гераічных чынау аж да сяньняшняга збройнага змаганьня з бальшавіцка—маскоускім акупантам нашых партызанау беларускі народ сьведама й безаглядна змагаецца за ажыцьцяуленьне ідэалу 25 Сакавіка, за адбудову абвешчанай ім незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі. Ідэі 25 Сакавіка сталіся на столькі папулярнымі у народзе, што навет усякія варожыя гэтым ідэям групы, усякія чужацкія дывэрсыі, каб здабыць нейкі уплыу сярод некаторае часткі беларускага грамадзянства, змушаны аблудна заяуляць аб сваей вернасьці ідэям 25 Сакавіка.

(Заканчэньне на 4 бал.)

У палоне імпэрыялістычнага маньяцтва

Калі прыгледзіцца да сяньняшняга разьвіцьця міжнародных узаемадачыненьняу, дык легка можна зауважыць, што увесь сьвет выразна увайшоу у новую, адменную ад папярэдняй эпоху сваей гісторыі. Сяньня ужо бадай няма ізаляваных ад рэшты сьвету дзяржавау, якія-б жылі сваім замкнутым як палітычным, гэтак і культурным ды эканамічным жыцьцем, сяньня зьнікнула таксама паняцьце гаспадарчай самавыстарчальнасьці цывілізаваных дзяржавау, як гэта у ладнай меры заувашалася на працягу мінулых стагодзьдзяу.

Новая палітычная структура усяго сьвету, што з асаблівай выразнасьцю заіснавала у вапошнія часы, выклікала неабходную патрэбу радыкальнае перабудовы міжнародных узаемадычыненьняу у кажнай галіне жыцьця. Сяньня у сьвеце заіснавалі дзьве магутныя проціулежныя й узаемна сябе выключаючыя сыстэмы —камуністычная, што знаходзіцца пад правадырствам Савецкага Саюзу і уключае, апрача апошняга, усіх савецкіх сатэлітау сярэдня-усходняй Эуропы ды чырвоны Кітай, і дэмакратычны блек дзяржавау.

Паміж гэтымі двумя сусьветнымі сіламі адбываецца сяньня бескампрамісовае змаганьне, вядзецца у сусьветным маштабе халодная вайна, якая у некаторых месцах, як у Карэі і часткова іншых краінах Далекага Усходу, перайшла у стадыю гарачае вайны.

Блек камуністычны, які, апрача камуністычных дзяржавау, мае у цэлым сьвеце на сваіх услугах пятыя калоны, зь неспатыканай у гісторыі безаглядласьцю й сярэднявечным фанатызмам пасьлядоуна імкнецца да поунага зьнішчэньня вольнага дэмакратычнага сьвету. К[illegible]мунізм не вызнае ніякага кампрамісу, ягонай асноунай і канчальнай мэтаю есьць запанаваньне над цэлым сьветам. Дэмакратычны блек у вабліччы няухільнае небясьпекі напружвае сяньня усе свае сілы дзеля собскае абароны— дзеля захаваньня міру, цывілізацыі і вольнасьці народау і чалавека, моцна загрожаных камуністычным таталітарызмам. Гэтае змаганьне між двумя варожымі сьветамі зьяуляецца ужо у вялікай меры татальным змаганьнем: яно праводзіцца у кажнай галіне жыцьця—у палітычнай, культурнай, эканамічнай і часткава мілітарнай, адным словам гэтае змаганьне адбываецца як у плашчыні матарыяльнай, гэтак і ідэялягічнай.

Няухільная загроза з боку сусьветнага камунізму й усьведамленьне таго факту, што генэральнага зудару паміж камуністычным і дэмакрат[illegible]ным сьветамі увікнуць ня удас[illegible] [illegible]рымусіла гэты апошні грун[illegible] [illegible] перабудаваць пануючую дагэтуль сыстэму міжнародных узаемадачыненьняу. Новая сусьветная вайна, да распаленьня якой імкнецца камунізм, ня будзе лякальным або больш менш абмежаваным у сваіх маштабах змаганьнем між паасобнымі дзяржавамі й народамі, якім у вялікай меры была першая, а навет і другая сусьветная вайна. Наадварот, гэта будзе сусьветная вайна у літаральным значэньні гэтага слова, калі бадай што ня знойдзецца ніводнай дзяржавы, якая—б ня была ей непасрэдна загрожанай і якая, у вабліччы гэтае загрозы, не патрабавала—б сур'езна прыгатауляцца да собскае абароны.

Таму усе вольныя народы сьвету, у імкненьнях да унікненьня або памяншэньня загражаючай ім небясьпекі, пачалі прыгатауляцца да абароны не індывідуальна й адзін ад другога ізалявана. Гэтыя народы ужо цьверда узышлі на шлях калектыунае дзейнасьці у сьведамасьці, што перад загрозай сусьветнае камуністычнае сілы, што імкнецца да сусьветнае мэты, можна абараніцца толькі злучанымі сіламі сусьветнага дэмакратызму.

Мы сяньня зьяуляемся жывымі сьветкамі цікавага гістарычнага працэсу, калі вольныя народы й дзяржавы задзіночваюцца у вялікія блекі, дабравольна зракаючыся часткі сваей сувэрэннасьці дзеля агульнае карысьці. Гэтая тэндэнцыя да блякаваньня праявілася ня толькі сярод малых народау і мілітарна слабых дзяржавау, чаго есьць прыкладам дзяржавы Бэнэлюксу ці Скандынаускі блек дзяржавау, але у роунай меры патрэбу такова міждзяржаунага задзіночаньня адчулі й вялікія магутнасьці сьвету, як Задзіночаныя Штаты Амэрыкі.

Увесь дэмакратычны сьвет, незалежна ад геапалітычнага палажэньня сваіх частак, разьвіваецца сяньня пад знакам такога міждзяржаунага задзіночаньня. Найбольш вымоуным і канкрэтным гэтага прыкладам зьяуляюцца бясспрэчна дзяржавы Атлянтычнага пакту, якія ужо сяньня прыступілі навет да тварэньня супольнай эурапэйскай арміі пад адзіным вярхоуным камандаваньнем. Насьпявае таксама патрэба й вядуцца ужо прыгатауленьні да стварэньня падобнага Міжземнаморскага абароннага пакту, а таксама Ціхаакіянскага абароннага пакту. Незалежна ад гэтага папулярнай зьяуляецца ідэя задзіночаных штатау Эуропы, якая здабывае што раз больш прыхільнікау і энтузыястых навет сярод вядучых палітыкау і дзяржауных мужоу сьвету.

Такія формы міждзяржаунага задзіночаньня вымагаюць ад ягоных сяброу вялікае палітычнае сьпеласьці, узаемнае згоды й пашаны правоу кажнага зь іх. І трэба з асаблівым націскам падчыркнуць, што заходні сьвет выказау у гэтым кірунку вялікуюпа літычную сьпеласьць. Вымоуным гэтага прыкладам можа служыць прыняцьце да эурапэйскай сям'і народау Заходняе Нямеччыны й прынцыповая згода на стварэньне нямецкае арміі у рамах эурапэйскіх збройных сілау, што наступіла ня гледзячы на спрадвечную варожасьць між Францыяй і Нямеччынай.

Такім чынам у вольным дэмакратычным сьвеце грунтоуна перабудоуваюцца дасюлешнія паняцьці й насьпяваюць новыя ідэі, якія бясспрэчна адкрываюць новую балону у гісторыі усяго чалавецтва. Справа ясная, што патрэба такое перабудовы узаемных дачыненьняу вольных народау у аснауным была выклікана агрэсыяй сусьветнага камунізму й канечнасьцю абароны перад ею. Але ня можа быць найменшага сумліву і у тым, што у не малой меры спрычыніліся да гэтага й патрэбы эканамічныя ды культурныя. Таму няма падставау думаць, што у выпадку зьнікненьня камуністычнае загрозы сьвет ізноу падзеліцца на цэлае мноства ізаляваных ад сябе дзяржавау і што дасьць падставы да узьнікненьня бесьперапынных супярэчнасьцяу і разыходжаньняу між імі. Усе гаворыць за тым, што само жыцьце зь ягонымі патрэбамі палітычнымі, эканамічнымі ды культурнымі прадыктуе вольным народам сьвету патрэбу будаваць сваю будучыню на прынцыпах як найцясьнейшага зьліжэньня й супрацоуніцтва.

У аспэкце гэтага вялікага гістарычнага працэсу асаблівая нашая увага павінна быць зьвернутая на палітычныя канцэпцыі народау, паняволеных сяньня бальшавізмам.

Вольныя дэмакратычныя народы, як было ужо сьцьверджана, даказалі на дзеле, што яны ужо поунасьцю дасьпелі да будаваньня свайго жыцьця на прынцыпах міжнароднай салідарнасьці й цеснага супрацоуніцтва.

Затое з сумам трэба сьцьвердзіць, што палітычная думка народау па той бок зялезнай заслоны, дакладней сярод палітычных эміграцыяу гэтых народау у вялікай ступені знаходзіцца яшчэ у палоне перастарэлых і пераапшых свой век паняцьцяу.

Не мяняе агульнай сытуацыі факт, што сярод эміграцыяу з Усходу зрадзіліся таксама палітычныя канцэпцыі да стварэньня у будучыні сярод нерасейскіх народау, паняволеных сяньня бальшавізмам, супольнага міждзяржаунага арганізму, які—б загарантавау вольнасьць і незалежнасьць гэтых народау, што у сілу свайго геапалітычнага палажэньня знаходзяцца паміж молатам і кавадлам нямецкага і расейскага імпэрыялізму.

Гэтыя канцэпцыі выразіліся у ідэях АБН,«Інтэрмарыюм» і іншых міжнацыянальных арганізацыяу. Аднак усе гэтыя канцэпцыі зьяуляюцца сяньня яшчэ пазбауленыя глыбейшага ідэалягічнага фундаманту. Перажыткі нацыянальнага шавінізму й імпэрыалістычныя паняцьці даваеннага часу сяньня паралiжуюць дзейнасьць гэтых арганізацыяу і аслабляюць давер да задэкляраваных імі палітычна—дзяржауных канцэпцыяу.

Прыкрым гістарычным анахранізмам зьяуляецца факт, што тыя падсавецкія народы, якія хочаць у сваіх будучых дзяржавах задаволіцца толькі сваім собскім, не жадаючы нічога чужога, належаць яшчэ дагэтуль бадай да мяншыні. Усе іншыя мрояць яшчэ дагэтуль аб пашырэньні сваіх межау і разбудове сваей магутнасьці за кошт вольнасьці й незалежнасьці іншых народау, ня маючы да гэтага ніякіх юрыдычных падставау.

Каб ня быць галаслоунымі, зьвернем тут коратка увагу на падобнага роду імпэрыялістычныя імкненьні нашых суседзяу у дачыненьні да беларускага народу. Ня будзем пры гэтым гаварыць аб расейцах, якія наагул ня думаюць зракацца прэтэнсыяу да паняволеньня усіх тых народау, што уваходзяць сяньня у склад Савецкага Саюзу, скажам толькі аб народах, ім паняволеных. Першая увага належыцца палякам, якія не выбражаюць сабе будучае Польшчы бяз усходніх граніцау 1939 г. і за прывярненьне якіх вядуць сяньня на эміграцыі ажыуленую палітычную й прапагандовую дзейнасьць. Гэтак паступаюць аутары канцэпцыі «Інтэрмарыюм», паводля якой гарантуецца вольнасьць і дзяржауная незалежнасьць усім народам паміж Балтыцкага, Чорнага й Адрыятычнага мора, у тым ліку і народу беларускаму. Дзе-ж тут пасьлядоунасьць паміж прыгожымі лезунгамі «Інтэрмарыюм» і усіх польскіх палітычных дзейнікау на эміграцыі! Зусім гумарыстычнымі зьяуляюцца прэтэнсыі летувісау да Вільні й вялікай паласы чыста беларускіх тэрыторыяу аж да Маладэчна толькі на тэй падставе, што уся гэтая частка Беларусі была у 1920 г. перададзеная бальшавікамі Летуве, хоць апошняя практычна не уладала ею. Ня гледзячы на тое, што як да Вільні, да якой ня маюць летувісы ніякіх гістарычных падставау, так да рэшты беларускіх тэрыторыяу, дзе ніводнага летувіса нельга знайсьці ізь сьвечкай, летувіскія прэтэнсыя зьяуляюцца нічым неабаснаваныя, у духу гэтых дзіуных маячаньняу выхоувалася да вайны уся летувіская моладзь у школах на бацькаушчыне і выхоуваецца сяньня на эміграцыі. Гэтаксама й некаторыя украінскія колы на этнаграфічных картах Украіны перасоуваюць свае пауночныя межы у глыб цэнтральных беларускіх тэрыторыяу ды у сваіх «навуковых» працах і школьных падручніках беспадставна асьмельваюцца прысабечваць нашую гістарычную спадчыну. Пры гэтым нельга не адцеміць, што тыя украінцы, якія гуртуюцца вакол АБН—арганізацыі, што базуецца на ідэі пашанаваньня дзяржаунай незалежнасьці усіх народау у іхных этнаграфічных межах—ні разу не запратэставалі супраць імпэрыялістычных імкненьняу сваіх суродзічау.

Такія сяньня дачыненьні нашых суседзяу да беларускага народу. Такія-ж самыя узаемадачыненьні мы заувашым і паміж палякамі й украінцамі, паміж чэхамі й славакамі, паміж сэрбамі й харватамі, і гэтак без канца. Бо мала яшчэ сяньня знойдзецца такіх палітычных групау, як чэская група генэрала Прхалі, што, вызнаючы правы славакау на поуную дзяржауную незалежнасьць, асьмелілася парваць з традыцыйнымі плянамі чэскага захопніцтва у дачыненьні да гэтага вароду.

Ясна, што такія узаемадачыненьні паміж нашымі народхмі ня змогуць прывесьці ані да стварэньня трывалага й на здаровых асновах абапертага у будучыні міждзяржаунага арганізму, ані узбуджэньня узаемнага даверу між ягонымі сябрамі. А гэта між іншым зьяуляецца адной з найважнейшых передумовау, вядучых да зьдзейсьненьня нашых нацыянальных мэтау-зьнішчэньня бальшавізму й адбудаваньня собскіх незалежных дзяржавау, якія змаглі-б пасьпяхова процістаяць усякім далейшым імпэрыялістычным пасяганьням на іхную цэласьць.

З другога боку мы ніколі ня узбудзім сымпатыі з боку дэмакратычнага сьвету, перадусім ЗША, і не здабудзем ягонага падтрыманьня у нашых нацыянальных імкненьнях, пакуль не дакажым на дзеле, што мы дастаткова дасьпелі да таго, каб жыць самастойным жыцьцем у сям'і усіх іншых вольных народау, пакуль не навучымся шанаваць прыродныя нацыянальныя правы сваіх суседзяу, ях іх шануюць усе народы Захаду. Нашыя міжсобныя сваркі й пасяганьні на сувэрэннасьць адзін другога зьяуляюцца сяньня найвастрэйшым супраць нас аружжам у руках расейскіх імпэрыялістых, якія стараюцца пераканаць Захад, што мы яшчэ не дарасьлі да незалежнага дзяржаунага жыцьця і што распадзел расейскае імпэрыі прывядзе толькі да балканізацыі эурапэйскага усходу й падсавецкай Азіі. Наяунасьць сярод палітычных угрупаваньняу паняволеных бальшавізмам народау перажыткау імпэрыялізму й нацыянальнага шавінізму у эпоху, калі такія тэндэнцыі ужо поунасьцю зьвіклі сярод народау дэмакратычнага Захаду, выстауляе нам вельмі адмоуны атэстат, што сьветчыць аб нашай рэакцыйнасьці й няздольнасьці да дзяржаунага жыцьця на сучасным дэмакратычным узроуні.

Усе гэта гаворыць вымоуна за тым, што ужо найвышэйшы час, каб паняволеныя бальшавізмам народы поунасьцю атрэсьліся ад шкодных перажыткау мінулага й навучыліся шанаваць нацыянальныя правы іншых народау, як і свае собскія. Ужо дауно пара, каб мы у сваей палітычнай дзейнасьці даказалі перад Захадам, што ужо зьяуляемся дасьпелымі да дзяржаунага жыцьця у дэмакратычным разуменьні гэтага слова.

Мы не павінны забывацца, што без переузгадаваньня самых сябе у духу дэмакратычных ідэяу вольнасьці і без перабудаваньня у гэтым кірунку нашых міжнацыянальных узаемадачыненьняу зьдзейсьненьне нашых нацыянальна - палітычных мэтау будзе справай даволі праблематычнай.

Язэп Каранеускі

Чытайце й пашырайце беларускую незалежніцкую газэту

«БАЦЬКАУШЧЫНУ»!

Складайце ахвяры на Выдавецкі Фонд

«БАЦЬКАУШЧЫНЫ«!

Шануйма Родную Мову

Калі беларускае незалежнае гаспадарства—Вялікае Княства Літоускае апынулася у стадыі палітычнага й культурнага заняпаду, а у канцы ХУІІІст. было сілком прылучанае да Расеі, дык і ягоная літаратурная мова, будучая дзржауною моваю ня толькі на тэрыторыях этнаграфічна беларускіх, але й летувіскіх ды часткава украінскіх, уваходзячых у склад Вялікага Княства, спачатку паступова, а пазьней поунасьцю перастала ужывацца. Сталася яна такім чынам толькі гістарычнай вартасьцю, захаванай у старых рукапісах і друкаваных выданьях, падобна як стара-грэцкая ці лацінская мовы.

Калі-ж з пачаткам XIX ст. пачынаецца беларускае нацыяналанае адраджэньне, а разам зь ім і адраджэньне беларускага пісьменства, те нэшыя адраджэнцы не сягнулі да старой беларускай літаратурнай мовы , амаль поунасьцю ужо забытай і выціснутай з практычнага ужываньня, а пачалі тварыць новую літаратурную мову на базе цэнтральна-заходніх беларускіх дыялектау.

Трэба з асаблівым націскам падчыркнуць, што першыя адраджэнцы былі людзьмі вышаушымі з нацыянальна чужой школы, пераважна расейскай або польскай, дзякуючы чаму, прабуючы пісаць пабеларуску, зусім нясьведама уводзілі у беларускую мову мноства словау і зваротау, узятых жыуцом з мовы польскай або расейскай. Такое запазычаньне асабліва мела месца у тых выпадках, калі для выражэньня розных паняцьцяу, сваяасаблівых культурным сфэрам грамадзянства, нельга было знайсьці патрэбных словау у мове народнай, якой гаварылі адно толькі мала пісьменныя, а часьцей зусім няпісьменныя масы сялянства.

Прауда, наступныя пакаленьні беларускіх пісьменьнікау ды наагул людзей пяра шырака узбагачвалі й удасканальвалі мову сваіх папярэднікау, ачышчалі яе старанна ад чужых напластаваньняу ды уводзілі цэлае мноства новых словау і выражэньняу, чэрпаючы іх зь вялікае скарбніцы мовы народнае. Незалежна аднак ад гэтага усе-ж такі у мове нашай асталося й да сяньня шмат чужых элекэнтау, якія легка замяніць словамі чыста беларускімі, узятымі з мовы народнай або старой літаратурнай мовы, што яшчэ сяньня зьяуляюцца зусім мала пашыраныя або й зусім няведамыя.

Але тут якраз і напатыкаемся на вялікія цяжкасьці з прычыны нічым не апрауданага, а выкліканага хвальшывымі псыхалягічнымі матывамі моунага кансэрватызму грамадзянства якое із незразумелым фанатызмам бароніцца перад усякімі моунымі інавацыямі, хоць-бы яны былі поунасьцю апрауданымі ня толькі фанэтычнымі ці марфалягічнымі законамі беларускае мовы, але былі навет пашыранымі у народных дыялектах усяго беларускага моунага прастору.

Даходзіць часамі да такога абсурду, што навет людзі пяра ахвотна ужываюць словау ці выражэньняу расейскіх або польскіх, хоць іх легка можна замяніць ужо агульнапрынятымі беларускімі, ня бачачы у гэтым нічога шкоднага, тады калі проста крычаць гвалт, спатыкаючы у іншых словы чыста беларускія, але рэдка дасюль ужываныя ці зусім яшчэ ня ужываныя у мове літаратурнай. Гэты не зразумелы нам і шкодны звычай хай зілюструюць два наступныя прыклады з газэты „Беларускі эмігрант“:

Зьмяшчаючы зацемку аб выхадзе новай беларускай газэты у ЗША „Беларус“, канадзкі „Беларускі Эмігрант“ (№. 8 за 30. 9. 1950) піша : „Прыкра разяць (полевізм - Рэд.) чытача некаторыя „крывіцкія“ словы, якія стараецца туды прахнуць Янка Станкевіч. Пажадана было-б, каб рэдкалегія сачыла за чысьціней беларускае мовы“. Прыгледзімся, як рэдакцыя „Беларускага Эміграната“ сочыць за чысьціней собскае мовы? У тым-жа самым нумары знаходзім цэлы рад прыкрых русыцызмау і палянізмау для абазначэньня паняцьцяу, для якіх існуюць агульна пашыраныя словы чыста беларускія. Гэтак знаходзім там такія палянізмы, як „паднечваныя“ (замест „падбухторваныя“), „угалошвяцца“ (зам. „зьвяртацца“), „замауляць“ (зам. „заказваць“), „на разе“ (зам. „пакуль што“), або русыцызмы, як „маюцца на продажы“ (зам. „есьць на продажы“), „распачаушаеся“ (зам. „што распачалося“) і г п.

Вось-жа гэтыя словы й хвормы, вырваныя жыуцом з польскае й расейскае мовы, зусім „ня разяць“ рэдакцыі „Беларускага Эміграната“. Затое, паверце, яны „разяць“, і то балюча „разяць“ кажнага беларуса і якраз прывіваюць засьмечаную мову усім тым чытачом, якія у пытаньнях мовы вельмі мала або зусім не разьбіраюцца.

Затое усе тыя „крывіцкія“ словы „Беларуса“, супраць якіх выступае „Беларускі эмігрант“, зьяуляюцца пашыранымі у беларускіх дыялектах, а таму могуць быць уводжаныя у літаратурную мову із бясспрэчнаю карысьцю для апошняй.

У іншым нумары (№. 10—11 за 25,-12-50), палемізуючы з групай беларускіх літаратарау зь Нью—Ерку, рэдакцыя „Беларускага Эміграната“ аутарытэтна заяуляе, што шмат якія словы, ужываныя др. Янкам Станкевічам, зьяуляюцца для беларусау „простым пасьмешышчам„ і для доказу сваей правільнасьці прыводзіць ліст сп. М. Белямука, які з гледзішча на саліднасьць газэты і карысьць ягонага аутара, што зь дзіцячай наіунасьцю і недасьпелай самаупэуненасьцю намагаецца вучыць тых, ад якіх сам павінен яшчэ вельмі многа вучыцца, не павінен быу-бы быць зьмешчаным наагул.

А вось некалькі найбольш яркіх красачак із слоуніка гэтага-ж нумару «Беларускага Эміграната»: «апавядаюць» (зам „расказваюць»), „у разе небясьпекі“ (зам. у „выпадку небясьпекі“), „з узгляду“ (зам. «з гледзішча»), „прагалошаньне“ (зам. „абвешчаньне“), „пад провадам“ (зам. „пад кірауніцтвам“), „на зьнешнім фронце“ (зам. „на вонкавым..“), „бракуе“ (зам. „не стае“), „адносячайся“ (зам. „што адносіцца“), і іншыя, узятыя жыуцом з польскае, расейскае ды украінскае мовау.

У дадзеным выпадку мы абсалютна, не зьбіраемся бараніць усіх чыста моуных інавацыяу др. Я. Станкевіча уважаючы, што многа спасярод іх есьць дарэмнай натугай іхнага аутара. Вялікая, калі навет ня большая колькасьць уводжаных др. Я. Станкевічам словау і хвормау напэуна беларуская літаратурная мова ня прыйме, ня гледзячы навет на тое, што яны у вялізарнай бальшыні узятыя зь беларускіх народных дыялектау. І гэта зусім натуральна. Ня усе прапановы розных рэфарматарау усіх часоу і народау у галіне мовы былі прызнаныя й прынятыя. Аднак тыя іхныя праекты, што сталіся потым собскасьцю усяе літаратурнае мовы, значна яе узбагаціушы або ачысьціушы, былі бясспрэчнай іхнай заслугай.

З гэтага, і толькі з гэтага гледзішча мы павінны ацэньваць працу др. Я. Станкевіча, якая, бяручы у цэлым, есьць выдатна карыснай. Гэты беларускі ліцгвісты, на гледзячы на вялікую апазыцыю з боку ляікау, змог ужо прывіць нашай літаратурнай мове вялікае мноства новых словау і правільных граматычных хвормау на месца штучных наватворау і шкодных барбарызмау. Даволі калі прывядзем хоць адзіны тут прыклад із словам „спадар“, якое яшчэ перад апошняй вайной было у уяуленьні грамадзянства запраудным пасьмешышчам, якім празывалі іранічна токькі ягонага аутара. Сяньня-ж гэтае патрэбнае слова стался агульнай собскасьцю усіх нас.

Вышэй прыведзеныя прыклады узялі мы толькі зь „Беларускага Эміграната“ дзеля таго, што іменна гэтая газэта, ломячы кап'е у вабароне чысьціні беларускае мовы, сама супраць яе дапускаецца вялікага грэху. Але гэта не абазначае, што мова усяе астальное беларускае прэсы есьць беззаганная. Наадварот, за вельмі малымі выключэньнямі, бальшыня беларускае прэсы на эміграцыі зьяуляецца у вялікай ступені засьмечанай чужымі або штучна створанымі словамі й хвормамі, а некаторыя зь беларускіх выдавецтвау, як прыкладам рэлігійны часапіс „Зьвіч“, друкуецца штучна створаным жаргонам, чужым духу й характару нашай мовы.

Сярод шырэйшых кругоу нашага грамадзянства зауважваецца вельмі няправільны й зусім прымітыуны пагляд на мову. Яно ня хоча разумець, што мова, як і усякае іншае культурнае зьявішча, не зьяуляецца застыглай у сваіх хвормах, але вечна разьвіваецца у сувязі з разьвіцьцем людзкое думкі і узбагачваецца новымі словамі, хвормамі, й выражэньнямі у сувязі з паглыбленьнем і узбагачэньнем культуры й цывілізацыі дадзенага народу. У нас нярэдка можна пачуць наіуныя цьверджаньні, што нашто ужываць „ладны“, „ладне“, калі ужо есьць „значны“, значна“, або „еміна“, калі есьць „ежа“, ці „собскі“, калі есьць „уласны“ і г. п.

Вось-жа якраз на гэтым і палягае багацьце мовы. Кажная багатая й разьвітая мова звычайна мае мноства сынанімау, якія выражаюць розныя, часамі зусім дробныя адценьні значэньня тых самых паняцьцяу, а нярэдка мова, у працэсе свайго няупыннага разьвіцьця, адкідае адныя словы, зусім навет правільныя, замяняючы іх новымі. Такое зьявішча

За правільную ацэну фактау

Калі той або іншы часапіс зьмяшчае нейкі артыкул, яд дыскусыйны, із зьместам якога рэдакцыя не згаджаецца й заклікае іншых выказвацца на закранутую у ім тэму, дык артыкул такі звычайна зьмяшчае новыя й арыгінальныя думкі, якіх не падзяляе яшчэ усе грамадзянства. Але калі гэты артыкул будзе толькі сьцьверджаньнем або запярэчаньнем рэчау агульна ведамых і усебакова даказаных, што ужо знаходзяцца паза усякай дыскусыяй, то у першым выпадку будзе ен толькі лішнім баластам, нічога новага ня прыносячым, а у другім—можа прынесьці толькі шкоду, зацямняючы агульнаведамыя справы перад мала зарыентаванымі чытачамі.

Да гэтай апошняй катэгорыі належыць артыкул сп. А. Грыцука «Мэмэнто», зьмешчаны, як дыскусыйны, у Но 10-11 «Беларускага Эмігранта». Аутар гэтых радкоу глыбака паважае сп. Грыцука, як сумленнага й ідэйнага працауніка на беларускай ніве, і таму ня можа ня дзівіцца, што у сваім артыкуле выказау ен вельмі павярхоуны й аусім хвальшывы пагляд на беларускую эміграцыйную запраудпасьць.

Нельга у вадным артыкуле закрануць усіх памылак аутара успомненага артыкулу. Таму спынімся толькі на найбольш кардынальнай памылцы, дзе ен ня змог пабачыць абсалютна ніякай прынцыповай ідэалягічнае розьніцы паміж беларускімі незалежнікамі й зарубежнікамі, прыпісваючы усе разыходжаньні між імі толькі «няпрымірымасьці амбіцыяу.» Аб гэтым чытаем дасломна: Гаворыцца скрозь, што няпрымірымасьць БНР і БЦР асноуваецца на скрайніх, ідэалягічных паглядах. Мне, аднак, здаецца, што разьдзел зрабіла не няпрымірымасьць ідэалегіяу, а няпрымірымасьць людзкіх амбіцыяу, і ня людзі падбіраліся да ідэалегіяу, а ідэалегіі ствараліся пад амбіцыі людзей».

На гэтым хвальшывым цьверджаньні базуюцца усе іншыя вывады артыкулу. Зь іх бачым што між незалежнікамі й зарубежнікамі быццам няма абсалютна ніякіх ідэалягічных разыходжаньняу, што усе яны аднолькава добрыя беларусы, што толькі хвальшывыя амбіцыі паасобных адзінак ды змаганьне за кіруючыя становішчы у грамадзянстве прывялі да сварак і падзелу. Легіка такога развaжаньня, як бачым, чыста зарубежніцкая з тэй толькі розьніцай, што аутар «Мэмэнто» есьць шчырым і, пішучы гэта, ня мае ніякіх задніх думак, тады калі зарубежнікі, высоуваючы на першы плян няпрымірымасьць амбіцыяу і змаганьне за уладу, як прычыны разыходжаньняу, сьведама стараюцца зацямніць і адсунуць на задні плян сваю праступную з нацыянальнага гледзішча дзейнасьць, якая іменна выклікала гэты падзел.

Ня «тоны палітычнае літаратуры», але паступаньне й дзейнасьць самых зарубежнікау есьць дастатковым доказам таго, што цяперашняе беларускае зарубежніцтва ня есьць нейкім прыпадковым ані нутраным беларускім зьявішчам, але што есьць яно толькі адным із этапау на доугім і незакончаным яшчэ шляху намаганьняу расейскага імпэрыялізму зьліквідаваць беларускі нацыянальна-вызвольны рух. Гэты палітычны кірунак паявіуся ужо тады, калі наагул пачалося беларускае адраджэньне. Ужо у часы Багушэвіча выяуляецца ен у г. зв. »западнарусізьме«, у пэрыяд «нашаніускі» ен актывізуецца вакол чарнасоценных газэтау «Крестьянин» і «Белорусская Жизнь», выдаваных расейцамі у проціувагу «Нашай Ніве», а у пэрыяд будаваньня беларускае дзяржаунасьці у 1917 і 1918 г.г. у дзейнасьці г. зв абласьнікоу, якія стаялі на грунце непадзельнасьці Расеі й змагаліся супраць незалежнасьці Беларусі. І як доуга будзе існаваць расейскі імпэрыялізм і ягонае пасяганьне на беларускую тэрыторыю, так доуга будзе існаваць у тэй або іншай форме беларускае зарубежніцтва й ягонае дывэрсыйная дзейнасьць.

Бо хто-ж рэпрэзэнтуе беларускае зарубежніцтва, як не перакананыя русафілы, што ня могуць сабе уявіць Беларусі без Расеі, і як не палітычныя авантурыстыя тыпу Астроускага, якія звычайна у кажнай дывэрсыі знаходзяць найлепшае поле для сваей дзейнасьці. Доказау на гэта есьць цэлае мноства. Хопіць толькі зьвярнуць увагу на тое, як зарубежнікі фанатычна баранілі русыфікатарскую палітыку бышага беларускага япіскапату й ягонае прылучэньне да Расейскай Зарубежнай Царквы, ад чаго й атрымалі у грамадзянстве назоу зарубежнікау, або зь якой ненавісьцю яны змагаліся й змагаюцца сяньня з адноуленай Беларускай Аутакефальнай Праваслаунай Царквой, каб пабачыць, як на далані, іхную верную службу антыбеларускай расейскай палітыцы. Гэта выявілася таксама у блякаваньні зарубежнікау з расейцамі у змаганньні з «крывічамі» або у іхных намаганьнях панізіць павагу й значэньне найвялікшай прaунай асновы нашых нацыянальных імкненьняу—Акту 25 Сакавіка і органау БНР, аб чым у свой час шырака пісалася у беларускай прэсе.

Сп Грыцук сяньня асьмельваецца цьвердзіць, што «правадыры БНР не змаглі стануць на вышыні прынятых на сябе заданьняу» і што «легкаважаньне й няздольнасьць да пашаны іншых думах і індывідуальнасьцяу прывялі да падзелу».

Што за наіунасьць аутара «Мэмэнто»! Якія-ж гэта «індывідуальнасьці» й «іншыя думкі» мае нуавеце сп. Грыцук? Ці-ж мы можам быць здольнымі да пашаны такіх індывідуальнасьцяу, як лідэр сяньняшняга зарубежніцтва й прафэсыянальны авантурысты Астроускі, які на працягу сваей дзейнасьці ужо некалькі разоу перакідвауся з ролі палянафіла у камуністычнага агента, прыносячы гэтым неаблічальныя школы беларускай справе. Прачытайце, сп. Грыцук, артыкул «Хто больш дасьць», зьмешчаны у вадным з папярэдніх нумэроу таго-ж «Беларускага Эмігранта». Там Вы знойдзеце аутэнтычныя дакумэнты, як той самы Астроускі у сваім пісьме з 1945 г. да польскага эгзыльнага прэзыдэнта В. Рачкевіча прапанау свае услугі й помач у замацаваньні польскіх прэтэнсыяу да земляу Заходняй Беларусі. Там таксама знойдзеце выпіскі з артыкулу Астроускага, зьмешчанага у Лендапскім «Аб'еднаньні», дзе ен асьмельваецца цьвердзіць, што Вільня гістарычная сталіца Беларусі й калыска беларускага адраджэнскага руху, павінна быць уключана у склад Летувы.

Або зьвярнецеся, сп. Грыцук, да Беларускага Нацыянальнага Камітэту у Нямеччыне, дзе Вам пакажуць натарыяльна пасьветчаную копію хвальшывага даносу у Галоуную Гасподу IPO у Нямеччыне, у якім цэлы рад выдатных беларускіх дзеячоу абвінавачваецца у фашызьме й камунізьме. Гэты ілжывы данос быу падпісаны ня кім іншым, як зарубежніцкімі правадырамі Ю. Сабалеускім і В. Рагуляй. А прыпомніце іншы «патрыятычны» чын зарубежнікау, як патаптаньне імі скаунцкіх і беларускіх нацыянальных сьцягоу у лягеры Міхэльсдорф, што выклікала станоукія галасы абурэньня й пратэсту з боку беларускае эміграцыі у цэлым сьвеце.

Гэткія прыклады можна множыць бязь ліку. Але й гэтых дастаткова, каб пабачыць, якія гэта «іншыя думкі» і «індывідуальнасьці» «мы легкаважым» і не шануем. У вадказ на гэты дзіуны закід мы можам толькі адказаць, што уважаем за свой людзкі гонар і нацыянальны абавязак станоука змагацца з такімі «думкамі» й «індывідуальнасьцямі», як скрайна варожымі для беларускай вызвольна ідэі.

У сваіх выказваньнях хочам быць аб'ектыунымі. Таму згаджаемся, што да зарубежнікау сьлепа прыстала пэуная частка добрых беларусау, зусім не здаючы сабе справы з таго, што прадстауляе сабою зарубежніцтва. Шмат такіх людзей, пабачыушы сваю памылку, вярнулася на правільную дарогу, а іншыя, мы верым, раней ці пазьней яшчэ вернуцца. Калі сп. Грыцук гаворыць, што «калі перад гэтым прыхільнікі БНР і БЦР былі сабе амаль варожымі нацыямі, то сяньня што раз больш беларусау усьведамляе сабе, што яны тае самае крыві й косьці»,—дык гэта якраз трэба аднесьці да тых людзей, што адходзяць ад зарубежніцтва, зразумеушы ягоную шкоднасьць.

Мы таксама ня зьбіраемся цьвердзіць, што й сярод нас усе чыста у парадку. Знойдуцца й тут многія памылкі, дакананыя нясьведама, бо, згодна прыказкі, ня мыляецца толькі той, хто нічога ня робіць. Мы згаджаемся, што й сярод нас есьць таксама хвальшывыя «апосталы праўды», як і тыя, што іх паважна за такіх уважаюць і узводзяць на высокія становішчы у вадплату за падхалімства зь іхнага боку. Ясна, што з такімі праявамі трэба змагацца, і усе сумленнае й ідэйнае беларускае грамадзянства змагаецца зь імі. А таму такіх зьявішчау нельга абагульняць і ставіць іх у віну усяго бээнэраускага кірунку.

Нельга пры гэтым прайсьці міма й іншага вынаходу сп. Грыцука, калі ен цьвердзіць, што «няудалы выскак з Крывіяй прынес неаблічальныя для сябе насьледкі». Няужо аутар артыкулу не здае сабе справы з таго, што накінуты нам Масквою назоу «Беларусь», «беларускі» зьяуляецца сяньня аднэй з найвялікшых нашых нацыянальных трагэдыяу? Асабліва мы эмігранты зьяуляемся жывымі сьветкамі, колькі гэты назоу прынес і прыносіць нам шкоды асабліва у нашых вонкавых дачыненьнях, калі ня толькі амэрыканцы, але й эурапэйскія народы толькі на гэтай падставе ідэнтыфікуюць нас з расейцамі. Яшчэ й сяньня у эурапэйскай прэсе часта густа ужываецца адно й тое самае слова «Вайсрусэн» ці «Уайтрашн» для абазначэньня так беларусау, як і старых расейскіх эмігрантау.

Якое вялізарнае значэньне для народу мае ягоны нацыянальны назоу, пакажам на пары прыкладах. Толькі на тэй падставе, што летувісы у свой час спрытна прысабечылі сабе наш стары нацыянальны назоу «Літва», «ліцьвін», якім яны віколі да таго часу не называліся, увесь Захад, за выключэньнем толькі спэцыялістых у гэтым пытаньні, уважае сяньня, што Вялікае Княства Літоускае было дзяржавай летавісау, а сталіца гэтага Княства Вільня—летувіскім горадам. Іншым вымоуным прыкладам могуць служыць украінцы. Калі б яны, падобна нам, называлі сябе й дагэтуль падараваным ім Масквою назовам «маларосы», то напэуна ня былі б яны шырака ведамыя у сьвеце, як зусім апрычоны народ, якімі есьць сяньня. Мы згодныя, што адна толькі эміграцыя ня можа зьмяніць нацыянальнага назову свайго народу. Але гэта зусім не абазначае, што побач з назовам афіцыяльным ня можа быць папулярызаваны й назоу запраудны, з нацыянальнага гледзішча толькі карысны, так як быу ен шырака папулярызаваны на бацькаушчыне у тыя часы, калі тэрор чырвонае Масквы яшчэ не дасягау беларускага народу.

І калі зарубежнікі павялі гвалтоуную кампанію супраць Крывіі, як назову быццам шкоднага, дык не таму, што ен мог бы быць узапрауды шкодны, але наадварот—што ен быу карысны, бо выбівау адно з наймагутнейшых аружжау з рук расейскіх імпэрыялістых у іхным змаганьні супраць беларускай незалежніцкай ідэі. Крывія іменна таму есьць страшная для зарубежнікау, што не зьмяшчае у сабе мілага іхняму сэрдцу й нагадваючага неразьдзельную сувязь з матушкай Расеяй слоуца «Русь», „рускі". А калі некаторыя, хоць, праўда, ня многія незарубежнікі былі таксама думкі, што справа Крывіі „прынесла неаблічальныя для сябе насьледкі", дык гэта абазначала, што людзі гэтыя настолькі былі засугэраваныя зарубежніцкай прапагандай, што міжвольна пачалі думаць ейнымі катэгорыямі.

Заканчэньне артыкулу сп. Грыцука есьць проста недапушчальным. У нашых публічных выступленьнях мы ня маем права ставіць на аднэй роуніцы людзей, між якімі ня можа быць абсалютна ніякага параунаньня з гледзішча на іхныя нацыянальныя заслугі. Таму толькі абурэньне могуць выклікаць наступныя словы „Мэмэнто": „Будзе найбольшай нашай трагэдыяй, калі у трэцяй сусьветнай вайне да барацьбы павядзе два із паловаю жаунеры Кушаль, а два із паловаю Радзевіч".

Вось-жа калі ходзіць пра сп. Кушаля, то есьць падставы верыць, што ен павядзе ня толькі два з паловаю жаунеры, але й значна болей, затое няма пакуль што ніякіх падставау верыць, што могб-ы быць здольны да нечага падобнага сп. Радзевіч. Сп. Кушаль у свой час із собскае ініцыятывы пераняу камандаваньне апушчанай усімі беларускай дывізыяй у Нямеччыне у найбольш крытычныя для яе часы вясной 1944 г., выступіу супраць немцау і перавеу яе на бок амэрыканцау. Потым-жа аж да апошняга часу сп. Кушаль зауседы актыуны прыймау удзел у беларускай нацыянальнай дзейнасьці, тады калі сп. Радзевіч за увесь гэты час займауся адно толькі чорным гандлем.

Беларуская каленія у Канадзе выказалася ужо зь вельмі дадатняга боку на фоне усяе беларускае эміграцыі. Вялікая грамадзкая актыунасьць нашых суродзічау у гэтай краіне, іхная ахвярнасьць і патрыятычны энтузыязм у усякім нацыянальным пачынаньні могуць служыць узорным прыкладам для іншых асяродзьдзяу нашае эміграцыі.

З другога аднак боку сярод некаторых канадзкіх беларусау заўважваецца часамі недастатковае разуменьне запрауднай сутнасьці грамадзкага працэсу сярод нашае эміграцыі, чаго найсьвяжэйшым прыкладам зьяуляецца між іншым артыкул „Мэмэнто". З матывау чыста нацыянальных мы радзім рэдакцыі „Беларускага Эмігранта" падобных артыкулау, што уносяць толькі заблытанасьць і дэзарыентацыю у справах ужо канчальна выясьненых і дакумэнтальна даказаных, больш не зьмяшчаць на сваіх балонах, навет як артыкулау дыскусыйных.

С. Крушыніч.

есьць поунасьцю натуральным, якое сьветчыць, што дадзеная мова есьць жывым і творчым зьявішчам, а ня мертвым і закасьцянелым у сваіх хвормах.

Не апошнюю ролю у перавазе тых а ня іншых словау з тым самым значэньнем адыгрывае іхная апрычонасьць, што іх розьніць ад мовау іншых народау. Гэта асабліва мае вялікае значэньне у народау, якія змушаныя бараніцца ад асыміляцыі з боку сваіх суседзяу, у дадзеным прыпадку ад асыміляцыі мовы. Ня трэба й даказваць, што з гэтага гледзішча больш адпаведнымі будуць для беларускае мовы словы «ладны», «еміна», „собскі", чымсьці „значны", „ежа", „уласны".

На заціраньне розьніцау паміж беларускай і расейскай мовамі зьвярнулі асаблівую увагу бальшавікі, незрауняныя майстры русыфікацыі. У ведамай пастанове аб г. зв. рэформе беларускага правапісу з 1933 г. адзін спасярод трох пунктау, што мелі апраудваць патрэбу гэтае рэформы, гаворыць пра „зьнішчэньне штучнае (чытай—натуральнае) бар'еры што аддзяляе мову беларускую ад мовы расейскае" Уся гэтая „рэформа", пашыраная з кажным годам самою практыкаю моунае палітыкі саветау, зьяуляецца ня чым іншым, як уводжаньнем у нашую мову што раз болей расейскіх словау і хвормау на месца чыста беларускіх, што сілком выкідаюцца зь яе, як «контррэвалюцыйныя», «нацыяналістычныя» ці „нацдэмаускія". Такая палітыка бальшавікоу у дачыненьні да нашае мовы якраз павінна у нас выклікаць асаблівую руплівасьць пра ейную чысьціню й імкненьне да як найбольшае ейнае апрычонасьці, што можна асягнуць шляхам дапушчэньня перавагі словау і хвормау, няведамых расейскай і пажадана іншым славянскім мовам.

Мы закранулі у гэтым артыкуле тэму чысьціні й апрычонасьці нашае мовы ды паказалі на некаторыя прыклады ейнага засьмечваньня не із мэтаю дакору у дачыненьні да нашых выдавецтвау, але толькі па тое, каб зьвярнуць увагу нашых суродзічау на гэтае вельмі важнае зьявішча й разбудзіць у іх пачуцьце пашаны да роднае мовы. Гэтая справа набірае сяньня першараднага значэньня. Праблема беларускае мовы на эміграцыі есьць ня толькі праблемай эміграцыйнай, але і агульнабеларускай. Сяньня выключна нашая эміграцыя мае магчымасьць паслугоувацца у публічным жыцьці запрауднай беларускай мовай, яе узбагачваць і разьвіваць ды руліцца пра ейную чысьціню. Гэтай магчымасьці зьяуляюцца сяньня пазбауленыя беларусы на бацькаушчыне. Тая беларуская мова, якая, у прыдатак да усеуладнага панаваньня расейскае мовы, дапушчана яшчэ на бацькаушчыне, ня есьць беларускай мовай у дакладным значэньні гэтага слова. Гэта есьць штучны белуруска-расейскі жаргон, створаны адумысьля, як часовая стадыя на дарозе да поунага пераходу на чыста расейскую мову. І гэты жаргон з кажным годам трациць што раз больш беларускіх асаблівасьцяу на карысьць расейскіх. Моуная палітыка на Беларусі есьць такім чынам аднэй із складовых частак агульнай русыфікацыйнай палітыкі бальшавікоу, што шалее у нашай бацькаушчыне.

Вось чаму нашыя заданьні у галіне мовы зьяуляюцца сяньня нязвычайна важнымі й адказнымі. Мы, беларускія палітычныя эмігранты зьяуляемся паклікаными гісторыяй да захаваньня беларускае мовы ад поунага зьнішчэньня да часу, калі нашая мова зможа свабодна разьвівацца у будучай Вольнай Беларусі. Вось чаму пытаньне беларускае мовы далека выбягае сяньня паза сфэру зьявішчау чыста культурнага характару й становіцца актуальнай справай агульнанацыянальнай і палітычнай. Дык выканайма гэтае нашае заданьне на эміграцыі у меру нашых сілау і магчымасьцяу як найлепей!

Др. Ст. Ст.

СТАРАЯ ПЕСЬНЯ НА НОВЫ ЛАД

Ніколі незаспакоены й нічым непаустрыманы імпэрыялізм есьць, як ведама, спрадвечнай рысай расейскае палітыкі. Запачаткаваная яшчэ у сівую старыну й зь нязвычайным дынамізмам праводжаная расейскімі царамі, гэтая палітыка сталася так сама аснауной рысай бальшавізму, што у вялікай ступені надае яму расейскі нацыянальны характар Апрача гэтага й усе расейскія антыкамуністычныя колы фанатычна трымаюцца яшчэ й дагэтуль імпэрыялістычнае лініі, праводжанае на працягу доугіх стагодзьдзяу расейскімі царамі і перанятае ад іх бальшавікамі.

Сяньня у век дэмакратызму й вызнаванай ім вольнасьці для усіх народау анахранічным дысанансам зьяуляюцца імкненні усіх расейскіх палітычных колау на эміграцыі да захаваньня у будучыні у той або іншай форме «единой и неделимой». Незалежна ад таго, што адныя расейскія угрупаваньні, прыкладам, манархістыя, зусім адкідаюць прынцып дзяржаунае незалежнасьці паняволеных Масквою народау, іншыя, больш прагрэсыуныя, гавораць аб нейкай культурнай ці адміністрацыйнай аутаноміі гэтых народау або навет дзяржаунае вуніі між імі, усе яны аднак згодныя у вадным: што Расея у той або іншай форме павінна захавацца непадзельнай.

Апошнім аднак часам некаторыя расейскія групы, прыкладам уласаўцы, пабачылі, што вызнаваная імі палітычная лінія у дачыненьні да нерасейскіх народау моцна б'е па іх самых і выстауляе іх у вельмі некарысным сьвятле перад заходнім сьветам. Таму на балонах свае прэсы пачалі яны рабіць быццам далека ідучыя адступленьні ад ранейшае палітыкі.

Гэтак, напрыклад, газэта «Голос Народа» (№ 2 (6) за 4. 2. 51) — орган «Союза Борьбы за Освобождение Народов России», што выходзіць у Мюнхэне, у вартыкуле «Сжатым кулаком» цьвердзіць, што для дабра, як расейскага, гэтак і іншых народау, што увaходзяць у склад Савецкага Саюзу, найбольш адпаведнай дзяржаунай формай будзе дабраволны саюз усіх гэтых народау. Новае тут у тым, што гэты саюз мае быць іменна дабравольны. «Асноваю ствареньня такое дзяржавы — на думку газэты — павінна быць роунасьць народау Расеі, іх запраўднае права на нацыянальнае разьвіцьцё, самавызначэньне і дзяржауную самастойнасьць. Усе іншыя шляхі разьвязаньня гэтай важнай праблемы, зьвязаныя з абмежаваньнем правоу народау або із спробаю іх прымусовага утрыманьня у рамках «единой и неделимой России», на нашую думку, могуць прывесьці толькі да бесьперапынных «малых» войнау унутры краіны, ад якіх будзе цярпець і агульная свабода і дабрабыт яе народау».

Некаторыя спасярод беларусау, глыбей незарыентаваныя у запрaудным сэнсе мовы расейскіх палітыкау, а таксама й многія заходнія палітыкі, што ніяк яшчэ ня могуць пабачыць на тэрыторыі аднэй шостай многіх іншых нацыянальна дасьпелых народау, апрача расейскага, могуць ухапіцца за такую дэкларацыю, як за найлепшае й найшчасьлівейшае разьвязаньне нацыянальнае праблемы эурапэйскага Усходу й падсавецкай Азіі.

Аднак так яно ня есьць. Далейшыя словы перадавіцы «Голасу Народу» як ня трэба лепей расшыфроуваюць запрауднын намеры расейцау. Там мы чытаем дасломна:

«Некаторыя людзі склонныя патрабаваць ад нас сяньня безадкладнага абвешчаньня дзяржаунае незалежнасьці земляу, што уходзяць у склад Расеі. Такія патрабаваньні больш чымсьці нясур'езныя. Ніводная палітычная ані нацыянальная фармацыя Зарубежжа не упаунамочаная ад імя таго ці іншага народу патрабаваць гарантыяу або, наадварот, даваць гарантыі. Такія гарантыі, калі-б мы іх далі, былі-б раунасільныя хвальшывым вэксалем».

Калі глыбей прааналізаваць прыведзеныя тут словы, то пабачым, што гэтая заява ні у чым ня розьніцца ад усіх ранейшых заявау расейцау, што пра разьвязаньне нацыянальнага пытаньня падсавецкіх народау можа быць мова толькі пасьля зьнішчэньня супольнымі сіламі гэтых народау бальшавізму. Бо сяньняшнія запэуненьні расейцау пра іхную згоду на дзяржауную незалежнасьць паняволеных Масквою народау і адначасная адмова зь іхнага боку загарантаваць ужо сяньня гэтыя запэуненьні есьць ня чым іншым, як няудала замаскаванай ігрой словау. Значыцца ізноу старая песенька, толькі ужо на новы лад.

Бо хіба-ж не прыпадкова забылася расейская газэта пра тое, што ані мы, беларусы, ані іншыя паняволеныя Расеяй народы ня маюць найменшае патрэбы сяньня абвяшчаць дзяржаунае незалежнасьці сваіх бацькаушчынау, што і бяз гэтага ужо ад даужэйшага часу есьць дакананым фактам. Дзяржауная незалежнасьць і беларусау, і туркестанцау, і украінцау, і каукасцау, як і шмат якіх іншых народау, была абвешчаная гэтымі народамі яшчэ у 1918 г. Далейшым актам у гэтым працэсе было стварэньне гэтымі народамі іхных незалежных дзяржавау, вызнаных «дэ юрэ» і „дэ факто" многімі дзяржавамі сьвету. І голас усіх гэтых народау, свабодна выказаны імі у 1918 г., зьяуляецца і сяньня адзіна правамоцным.

Ня нашая віна, што потым Беларусь, ня гледзячы на свой збройны супраціу, ізноу сталася ахвярай расейска-бальшавіцкага імпэрыялізму. Больш таго! Беларускі, як і іншыя паняволеныя Расеяй народы, увесь час пасьля гэтага астауся верным ідэі собскай дзяржаунай незалежнасьці і гэтую сваю вернасьць усестаронна задакумэнтавау у бесьперапынным змаганьні супраць расейска-бальшавіцкага акупанта.

Дык калі б расейцы, згуртаваныя вакол «Голасу Народу», мелі шчырыя намеры пазбыцца традыцыйнага імпэрыялізму й згадзіцца на дзяржауную незалежнасьць усіх падсавецкіх народау, дык не павінны былі-б хавацца за паначічнымі й нічога новага фактычна ня прынясучымі заявамі, але паставіць справу чэсна й адкрыта. А для гэтага патрэбна толькі згадзіцца з дауно ужо дакананым фактам і вызнаць гістарычныя акты усіх падсавецкіх народау аб іхнай непахіснай волі жыць незалежным дзяржауным жыцьцем, абвешчаныя імі яшчэ у 1918 г.

Алесь Крыга

Шляхам Незалежнасьці

(Заканчэньне)

Маладое беларускае гаспадарства, адбудаванае на моцы Акту 25 Сакавіка, хутка аднак было задушанае перавагаю лічбовае сілы нашых ворагау. Волялюбны беларускі народ стауся йзноу трагічнаю ахвяраю чужацкае няволі, якая шалее на нашай Бацькаушчыне да апошніх дзен. Аднак ідэі 25 Сакавіка—ідэі вольнасьці й незалежнасьці сталіся арганічнаю часткаю душы нашага народу, ягонага сьветапагляду, ягоных пачуцьцяу і ягонае волі. За гэтыя ідэі беларускі народ збройна змагаецца сяньня з бальшавіцка—маскоускім акупантам, за іх не шкадуе найлепшых сваіх ахвярау, за іх ідзе на страшныя мукі у савецкіх турмах і канцлягерах. Гэта зьяуляецца першым і найбольш пераконваючым доказам, што, ня гледзячы на страшныя мукі й зьдзек, беларускі народ не заломіцца пад цяжарам бальшавіцка-маскоускае няволі, але, як гавораць словы нашага нацыянальнага гымну, у крывавых муках пародзіць «жыцьце рэспублікі сваей».

Аднэй із важных прычынау, чаму адроджанае Актам 25 Сакавіка беларускае гаспадарства не змагло утрымацца пры жыцьці, было тое, што заходні дэмакратычны сьвет ня быу зацікаулены тады у распадзеле расейскае імпэрыі на нацыянальныя гаспадарствы паняволеных ею народау. Ані беларусы, ані іншыя падрасейскія народы, што абвесьцілі у той час свае незалежныя гаспадарствы, не атрымалі ад Заходу ня толькі канкрэтнай помачы, але навет не знайшлі там зразуменьня для сваей справядлівай справы.

Аднак такое становішча Заходу у дачыненьні да паняволеных народау эурапэйскага Усходу й падсавецкай Азіі пачынае грунтоуна рэвідавацца на нашую карысьць. Мы сяньня чуем што раз часьцейшыя высказваньні адказных амэрыканскіх палітыкау аб тым, што перадумоваю будучага трывалага міру зьяуляецца вольнасьць і незалежнасьць паняволеных расейскім бальшавізмам народау, у тым ліку і народу беларускага.

Ды іначай і быць ня можа. Дэмакратычныя ідэі вольнасьці, за якія змагаецца сяньня увесь вольны сьвет, толькі тады стануцца жывой і неперыможнай сілай, калі яны будуць загарантаваныя усім бяз выключэньня народам. Гэта есьць другім незапярэчным доказам таго, што у той гістарычны мамэнт, калі пасьля новага сусьветнага канфлікту, што ужо сяньня пачынаецца, будзе перабудоувацца сьвет на справядлівых асновах пашанаваньня правоу кажнага народу на ягонае вольнае й незалежнае жыцьцё, то тады, як гаворыць наш паэта, і Беларусь зойме «свой пачэсны пасад між народамі».

СПРАВЫ ДП

ПАЗЫКІ ДЛЯ ДП

У канцы лютага селета пры Нямецкім Банку для Упекачоу у Боне створаны «Аддзел для ДП», што не змаглі выэміграваць і астаюцца на стала у Нямеччыне. Пазыкі з гэтага банку будуць выдавацца толькі для заснаваньня або фінансаваньня ужо існуючых прадпрыемствау і варштатау працы, якія твораць базу існаваньня ДП і ягонай сям'і. Пазыкі ня могуць перавышаць 5.000 ДМ, толькі у вельмі выключных выпадках Дырэкцыя Банку можа павялічыць пазыку да 8.000 ДМ на сям'ю. ДП могуць задзіночвацца у супалкі з разьлікам, што аснауны капітал ня можа перавышаць 50.000 ДМ. ДП могуць таксама уваходзіць у супалкі зь немцамі, што навет рэкамэндуецца Банкам. Максымальны тэрмін сплаты пазыкі—16 год. На першых пяць год пазыка даецца на 2,5 проц., на далейшыя гады—на 5 проц. Аддзел ДП Банку мае запэунены пачатковы капітал у суме 2,5 мільёны ДМ. Далейшыя капіталы маюць быць атрымліваныя з прыдзелау пляну Маршаля. Пры складаньні заявы на пазыку есьць пажаданай рэкамэндацыя адпаведнага Нацыянальнага Комітэту, вызнанага церав IРО, значыцца для беларусау—Беларускага Нацыянальнага Камітэту у Нямеччыне. Гэтыя пазыкі будуць выдавацца не непасрэдна, а за пасярэдніцтвам якогасьці лякальнага банку, які можа выбраць сам ДП. У кірауніцтва ДП—Банку будзе у найбліжэйшым часе таксама пакліканая двухасабовая рэпрэзэнтацыя ДП.

Ніжэй падаем узор заявы у нямецкай мове для атрыманьня вышэйупомненай пазыкі:

An die Bank für Vertriebene

DP-Abteilung

Bonn

Betr. — Antrag auf Aufbauhilfe.

Der Unterzeichnete beantragt hiermit eine Anleihe zum Existenzaufbau von der DP-Abteilung der Vertriebenenbank und bittet um gtl. Aufnahme in die Bewerberliste, Zuteilung einer Nummer und die Zusendung der notwendigen Formulare.

Zur vorläufigen Vermerkung gebe ich folgende Personalangaben an:

1. Name und Vorname:
2. Genaue Anschrift:
3. IRO-Bescheinigung (DP Status) Nr.: Ausgestellt vom IRO Control Center am ....
4. Art des Unternehmens: ....
5. Höhe der beantragten Anleihe: ....
6. Bank oder die Sparkasse (Name und Anschrift) durch die die Anleihe verwaltet wird: ....

Indem ich Ihrer gefl. Mitteilung entgegensehe, verbleibe ich hochachtungsvoll

....
(Unterschrift)

Ад Рэдакцыі

З прыкрасьцю мусім сьцьвердзіць, што многія нашыя Прадстауніцтвы як у Нямеччыне, гэтак і паза ейнымі межамі, што займаюцца кальпартаваньнем «Бацькаушчыны», да гэтага часу не захацелі разьлічыцца з Адміністрацыяй за прададзеныя нумары газэты. Такія абыякавыя адносіны да прынятых на сябе абавязкау нашых прадстауніцтвау есьць галоунай прычынай, што «Бацькаушчына», намэрваючыся на пачатку свайго узнауленьня выходзіць рэгулярна раз у два тыдні, паяуляецца аднак вельмі нерэгулярна.

У сувязі з вышэйшым мы ветліва просім усе нашыя прадстауніцтвы у Нямеччыне і іншых краінах, а так-жа індывідуальных падпішчыкау, пасьля атрыманьня гэтага нумару правесьці дакладны разьлік з Адміністрацыяй за усе папярэднія нумары, а таксама выказаць больш энэргіі й добрае волі у далейшым кальпартаваньні й сьцягіваньні належных грошау за газэту.

Мы верым, што нашае грамадзянства, зауседы сьведамае вялікае нацыянальнае ролі роднае прэсы й ахвярнае на усякія нацыянальныя патрэбы, не дапусьціць да ліквідацыі «Бацькаушчыны».

Рэдакцыя

Пачатак новага курсу у ЗША

(Заканьчэньне)

5. Права рэлігійнае свабоды для усіх людзей сьвету.

6. Устанауленьне вольнай, дэмакратычнай і задзіночанай Нямеччыны з адказным урадам і гуманным правам для усяго народу на Усходзе й Захадзе.

7, Зварот Манджурыі дэмакратычнаму Кітаю.

Для нас асабліва важны пункт першы гэтай праграмы. У ім выдатны амэрыканскі палітык ставіць дамаганьне прывярненьня незалежнасьці Беларусі разам зь незалежнасьцю іншых паняволеных бальшавізмам народау, як перадумову зьнішчэньня бальшавіцка-расейскага імпэрыялізму, належнага унармаваньня міжнародных узаемадачыненьняу і захаваньня трывалага міру у сьвеце. Гэта першы аутарытэтны амэрыканскі голас за незалежнасьць Беларусі, першы станоукі голас супраць «единой и неделимой», голас за разьдзел расейскае турмы народау на нацыянальныя незалежныя дзяржавы. Ня гледзячы на тое, што у пералічэньні народау, для якіх дамагаецца Стасэн дзяржаунае незалежнасьці, не успамінаюцца грузіны, азэрбайджанцы, армяне, пауночныя каукасцы, ідэль-уралцы й іншыя, няма падставау думаць, што не дацэньвае ён патрэбы незалежнасьці й гэтых народау. Праудападобна пералічаныя ім народы падау ён як найбольш вымоуныя прыклады таго, што, паняволеныя Расеяю народы павінны мець права на сваю дзяржауную незалежнасьць, не вылічаючы усіх чыста народау, што на гэтае права заслугоуваюць.

Што Стасэн у сваіх высказваньнях не зьяуляецца адасобленым і што у Амэрыцы наагул пачынаецца новы палітычны курс у дачыненьні да паняволеных бальшавізмам народау, вымоуна сьветчыць пасланьне, перададзенае па радые 13 лютага селета амэрыканскім «Таварыствам Супольнае Справы», якое задзіночвае прадстаунікоу усіх прафэсыяу і усіх слаеу амэрыканскага грамадзянства. У гэтым пасланьні амэрыканцы запэуняюць, што Задзіночаныя Штаты Амэрыкі і увесь вольны сьвет цесна зьвязаныя з народамі Савецкага Саюзу і Усходняй Эуропы у іхным змаганьні за людзкую вольнасьць супраць тыраніі дыктатуры. Адзінай мэтай амэрыканскага народу есьць: »Свабода для усіх народау на сьвеце, права свабодна выбіраць собскі урад і права на пэрсанальнае і нацыянальнае самавызначэньне».

З гэтага бачым, што ня толькі палітыкі й некаторыя дзяржауныя мужы Амэрыкі, але й шырокія масы амэрыканскага народу дастаткова зразумелі прычыны сяньняшняга сусьветнага крызысу і выхад зь яго правільна бачаць у загарантаваньні вольнасьці й незалежнасьці усім народам, паняволеным бальшавізмам.

Заява Стасэна, што першая радыкальна парывае з амэрыканскай прарасейскай палітыкай, з палітыкай абыякавасьці, няяснасьці й недаказанасьці у дачыненьні да нерасейскіх народау эурапэйскага Усходу й падсавецкай Азіі, напоуненая такою-ж заявою прадстаунікоу амэрыканскага грамадзянства, адкрывае бясспрэчна новую балону у гісторыі амэрыканскай замежнай палітыкі. Астаецца толькі выказаць пажаданьне, каб новая палітыка амэрыканцау, запачаткаваная Стасэнам, сталася як найхутчэй афіцыяльнай палітыкай ураду ЗША, што прынесла-б толькі карысьць як самой Амэрыцы, так і народам, паняволеным бальшавіцкай Расеяй, а таксама і усяму дэмакратычнаму сьвету.

А. Крыга

Немцы пераймаюць лягеры ДП

3 лютага селета адбылося чарговае паседжаньне Прыбочнай Рады Безьдзяржауных Чужынцау пры Баварскім дзяржауным сэкратарыяце для справау упекачоу, на якім між іншым было пададзена да ведама пра новыя распараджэньні аб пераданьні усіх астальных лягерау ДП пад нямецкую адміністрацыю.

Агульная перадача усіх лягерау ДП, нямецкай адміністрацыі мае быць праведзена у сакавіку г. г., але ужо у лютым пераняли немцы ДП-лягер Шляйсгайм у Мюнхэне—Фэльдмохінгу. У лягерах, што пяройдуць пад нямецкую адміністрацыю, і надалей маюць астацца іраускія эміграцыйныя урады. Розьніцу між коштам утрыманьня у лягерах для нямецкіх упекачоу і іраускіх забавязваецца даплачваць IРО.

У амэрыканскай зоне безьдзяржауныя чужынцы поунасьцю падлягаюць нямецкай паліцыі й нямецкім судом, як у карных, гэтак і цывільных справах.

Арганізацыі й згуртаваньні безьдзяржауных чужынцау не падлягаюць болей абавязкавай рэгістрацыі перад акупацыйнымі уладамі. Іх трэба рэгістраваць у нямецкіх паліцыйных установах, так як і нямецкія арганізацыі. Справа дзейнасьці палітычных арганізацыяу чужынцау і іхнай рэгістрацыі яшчэ канчальна не разьвязана.

Сколькі выехала і сколькі асталося

Згодна афіцыяльнага паведамленьня IРО, у студзені 1951 г. выэміграваламіграрала з Заходняй Нямеччыны роуна 9.542 ДП. Бальшыня спасярод іх, найменна 7.660 ДП, выэміграваламі у ЗША, 945 у Аустралію, 160 у Канаду і некаторая, дробная часьць у Аргентыну, Францыю, Бразылію і іншыя краіны. У межах Заходняй Нямеччыны знаходзіцца яшчэ 46.600 ДП у лягерах IРО. Далейшая група 60.674 ДП пражываюць у нямецкіх лягерах для упекачоу. Яны й надалей маюць магчымасьць эміграваць пры дапамозе IРО. Найвялікшая чужынецкая група, найменна 100.700 асобау, жыве у Заходняй Нямеччыне на прыватных гасподах. Яны маюць забясьпечаную апеку IРО толькі у дачыненьнях эміграцыйных.

Колькасьць хворых і старых ДП, якія патрабуюць санатарыйнай і іншай спэцыяльнай апекі, выносіць у Заходняй Нямеччыне 12.865 асобау. Яны маюць магчымасьць эміграваць толькі на аснове спэцыяльнай дагаворанасьці паміж IРО і урадамі краінау, што згодзяцца іх прыняць.

У сувязі з карыснымі умовамі працы у ЗША, як і новай эміграцыйнай праграме Канады, Гадоуная Гаспода IРО лічыцца з тым, што у наступных месяцах эміграцыйная акцыя значна навялічыцца.

IРО надзеіцца, што у далейшым колькасьць эмігруючых у ЗША павялічыцца, калі прынятыя амэрыканскім кангрэсам палегкі знойдуць практычнае застасаваньне. На падставе гэтых палегкау будуць магчы эміграваць у ЗША намінальныя сябры нацыстаускіх, фашыстаускіх і камуністычных арганізацыяу. У сувязі з гэтым прадбачыцца, што зможа яшчэ выэміграваць 15 000 асобау, што перад гэтым былі адкінутыя.

Можна вучыцца у Бэльгіі

Цэнтраля Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяу на Чужыне пачала у свой час стараньні дзеля адкрыцьця беларускае гімназіі й зарганізаваньня інтэрнату у Лювэне (Бэльгія). Дзеля таго, што ужо есьць вялікія надзеі на пасьпяховую рэалізацыю гэтага пляну, усе зацікауленыя павінны у сваім собскім інтарэсе безадкладна зарэгістравацца у Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяу на чужыне, прысылаючы аб сабе наступныя пэрсанальныя дадзеныя: 1. Імя, прозьвішча, і дзень, месяц і год нараджэньня. 2. Ці мае бацькоу і дзе?, 3 Прафэсыя й цяперашні занятак бацькоу, 4. Асьвета, 5. Ці вучыцца цяпер і дзе?, 9. Якія ведае мовы, 7. Ці змог-бы пераехаць у Лювэн (із згодаю бацькоу ці апякуноу), 8 У якім кірунку хацеу-бы вучыцца пасьля атрыманьня сярэдняе асьветы, 9. Дакладны адрас.

Беларуская моладзь, што выедзе на студыі у Лювэн, будзе там на поуным утрыманьні. Кандыдаты змогуць выбіраць паміж гімназіямі на францускай і флямадзкай мове, а апрача гэтага будуць мець лекцыі зь беларускае мовы, літаратуры, гісторыі, сьпеваў і г. п. Пасьля сканчэньня гімназіі яны будуць мець практычную магчымасьць прадаужаць свае студыі у вышэйшай школе.

Апрача гэтага прыймаюцца таксама кандыдаты й для пачатковае школы. Парадак рэгістрацыі для іх той самы, што й для кандыдатау у гімназію.

Заявы й пералічаныя вышэй пэрсанальныя дадзеныя трэба перасылаць на наступны адрас:

Centre des Organisations Universitaires Bielorussiennes a L'etranger. Louvain, 8, Plac Hoover, Belgique.

НАШЫЯ ПРАДСТАУНІЦТВЫ ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ

1. У Бэльгіі:
Mr. M. Vostrikau, 8, Place Hoover, Louvain, Belgique.

2. У Ангельшчыне:
Association of Whiterutenians in Grait Britain, 52, Penn Rd., London, N. 7. England.

3, У Францыі:
Mr. Nicolai Lysucha, 8 R-Gambetta, St. Quen, Seine, France.

4. У ЗША:
Dr. Jan Stankievic, 6 Vandervoort Place. Brooklyn 6, New York, USA.

5. У Канадзе:
Mr. Joseph Pitushka, 131 Manning Ave. Toronto, Ont. Canada.

6. У Аргентыне:
Mierlak Konstantin, C. Rivadavia 1291, Buenos Aires, Argentina.

7, У Аустраліі:
Mr. Donat Jackievic, 60 Fisher Street, East Brisbane, Australia.

Непасрэдна з гэтых прадстауніцтвау просім суродзічау выпісваць «Бацькаушчыну».

Будзьце-ж пасьлядоунымі

«Беларуская Трыбуна», орган зарубежніцкай групы Астроускага у ЗША, у № 2 падала зацемку, што Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вініпэгу (Канада) арганізуе пратэстацыйную акцыю супраць таго, што некаторыя украінскія колы, выступаючы супраць пасяганьняу палякау на Вільню й Львоу, адступаюць Вільню Летуве. У зацемцы ад рэдакцыі «Беларуская Трыбуна» піша: «Мы з свайго боку поунасьцю гэтую акцыю падтрымоуваем і уважаем яе слушнай і справядлівай».

Як пратэстацыйная акцыя Беларускага Нацыянальнага Камітэту у Вініпэгу, гэтак і зацемка «Беларускай Трыбуны» зусім правільныя. Але чаму гэта «Беларуская Трыбуна», пратэстуючы супраць раздаваньня чужых тэрыторыяу украінцамі, не адазвалася ані адным словам супраць таго, што ідэйны правадыр згуртаванай вакол яе групы Астроускі у сваім артыкуле у Ленданскім «Аб'яднаньні» аддавау усю Вільню летувісам, пакідаючы для Беларусі адно толькі два дзерауляныя прадмесьці Ліпоуку й Новы Сьвет? Гэты «рэвэляцыйны» артыкул Астроускага бясспрэчна таксама ведамы й беларусам зь Вініпэгу, бо пра яго шырака пісалася у № 7 (29) канадзкага «Беларускага Эміграанта» (артыкул «Хто больш дасьць»).

Не падлягае найменшаму сумліву, што трэба пратэставаць супраць гэтых і іншых падобных рэвэрансау на карысьць летувісау, а супраць беларусау, робленых ня толькі сяньня некаторымі украінскімі коламі. Але у першую чаргу і з асаблівай станоукасьцю трэба пратэставаць супраць Астроускага, які, прэтэндуючы да кірауніцтва усяе беларускае эміграцыі, гойна раздае на права й на лева чужынцам беларускія землі, як і супраць Ленданскае групы зарубежнікау, што зьмясьціла у сваім органе гэты няслауны артыкул.

Дык будзьце-ж пасьлядоунымі, спадары рэдактары «Беларускай Трыбуны»!

Р. С.

Часапіс Беларускага Навуковага Т-ва

У студзені селета вышау у Нью Ерку першы нумар часапісу Крывіцкага (Беларускага) Навуковага Таварыства Пранціша Скарыны п. н. «Веда», які зьяуляецца адначасна першым беларускім навуковым часапісам на эміграцыі. Із навуковых працау нумар гэты зьмяшчае толькі адзін абшырны артыкул рэдактара часапісу Др. Я. Станкевіча п. н. «Крывіччына у „Толков'ым Словар'у Живаго Великорускаго Языка «В. Даля». Артыкул зьяуляецца абапертым на шырокіх філялягічных досьледах і мае для нас ня толькі навуковае, але у ня меншай меры й нацыянальнае значэньне. На падставе фанэтычнага, марфалягічнага й слоунікавага матарыялу Даля аутар устанауляе граніцу беларускае моунае тэрыторыі з расейскай, а гэтым самым і усходнюю граніцу спачатнага расьсяленьня беларускага народу. Гэтая граніца прабягае далека на усход, поунач і поудзень ад тых межау, якія сяньня прынята агульна уважаць за этнаграфічныя межы беларускае тэрыторыі. Ня гледзячы на тое, што беларускае насельніцтва гэтай шырокай паласы сяньня моцна зрусыфікаванае, няма аніякай аб'ектыунай падставы яго выракацца на карысьць расейцау і ня імкнуцца да уключэньня яго у склад будучай незалежнай Буларусі.

Новая Беларуская Газэта

З днем 25 сакавіка селета у Парыжы пачала выходзіць новая беларуская газэта «За Волю», якая мае быць супольным органам беларускіх эмігрантау у Францыі, Ангельшчыне й Бэльгіі. Зьмест першага нумару газэты даволі цікавы й шырока адлюстроувае незалежніцкія ідэалы беларускага народу, носьбітам якіх зьяуляюцца органы БНР.

З вонкавага боку газэта вельмі скромная, можа за скромная, апрача гэтага есьць у ей ня мала й тэхнічных заганау. Але усе гэта трэба вытлумачыць тым, што газэта набіраецца й друкуецца собскімі нефаховымі сіламі і у собскай, дзякуючы ахвярнасьці нашых работнікау у Францыі прыдбанай друкарні. Усе гэтыя заганы, якія—мы верым—у наступных нумарох будуць выпрауленыя, малеюць, калі узяць пад увагу той няштодзенны энтузыязм і патрыятычную ахвярнасьць невялікай беларускай калёніі у Францыі, зь якімі яна распачынае так важную нацыянальную справу. Таму адклікаемся зь вялікім прызнаньнем аб новай беларускай газэце й жадаем ей буйнага росту.